УДК 902/903/904(476)»19/20»

# АРХЕАЛАГІЧНАЕ ВЫВУЧЭННЕ ПОМНІКАЎ ЖАЛЕЗНАГА ВЕКУ І СЯРЭДНЯВЕЧЧА НА ТЭРЫТОРЫІ ПРАВАБЯРЭЖЖА БЕЛАРУСКАГА ПАНЯМОННЯ Ў ДАРЭВАЛЮЦЫЙНЫ ПЕРЫЯД

**Шаўковіч А. С.**
Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі
(г. Мінск, Беларусь)

Анатацыя. Дадзены артыкул прысвечаны працам археолагаў дарэвалюцыйнага перыяду, даследаваўшых помнікі эпохі жалеза і сярэднявечча, сканцэнтраваныя на правым беразе р. Нёман у абшарах сучаснай тэрыторыі Беларусі.

Ключавыя словы: археалогія, помнік, могільнік, гарадзішча, курган, раскопкі, выданне.

Summary. This article is devoted to work of archaeologists of the pre- revolutionary period who have researched medieval and Iron Age archeological sites, wich concentrated on the territory of right bank of Belarussian Paniamonnie.

Keywords: archaeology, site, barrows, hillfort, cemetery, excavations, publication.

Пачаткам археалагічнага вывучэння правабярэжжа Беларускага Панямоння можна лічыць ад першай паловы XIX ст., калі першыя сапраўдныя археалагічныя раскопкі ў рэгіёне пачаў праводзіць Т.Я. Нарбут. У рамках сваёй гісторыка-даследчай дзейнасці ён у 1820 годзе адкрыў і раскапаў грунтовыя і курганныя пахаванні недалёка ад свайго радавога маёнтка, які знаходзіўся ў мястэчку Шаўры Лідскага павета. Нарбут першы дакладна інтэрпрэтаваў курганныя насыпы як старажытныя пахаванні, аднак не змог вызначыць храналогію і этнічную прыналежнасць пахаваных [6, с. 5]. Пра свае вынікі ён паведамляў у артыкуле «O kurhanach: Badanie starożytności Litewskich» [29], а таксама закранаў пытанні археалогіі ў выданнях «Pomniejsze pisma historyczne, szczególnie do historii Litwy odnoszące się» [30], «Pomniki do dziejów litewskich» [31] і «Dzieje starożytne narodu litewskiego» [32], у якіх напісаў гісторыю, традыцыі, культуру літоўскіх зямель на працягу ўсяго іх існавання.

Адным з першых даследчыкаў рэгіёна таксама быў П.С. Вільчыцкі. Ён раскапаў курганны могільнік у в. Кляўіца [1, с. 71], аднак, на жаль, матэрыялы яго раскопак не захаваліся.

У 1846 годзе ў ходзе палявых разведак М. Балінскага было ўпершыню знойдзена і апісана гарадзішча ў в. Крэва, побач з якім было зафіксавана 4 вялікія курганы. Таксама ім былі апісаны гарадзішчы у Гальшанах, Свіры, Радуні і Лоску [25]. Адразу ж за ім, у 1848 г., спецыяльную работу, прысвечаную гарадзішчам і курганам Ашмянскага павета «O Kurhanach i Grodziskach Powiatu Oszmiańskiego» падрыхтаваў Р.С. Зенькевіч. У гэтай працы ён апісаў знешні выгляд помнікаў, ажыццявіў абмеры і прывёў мясцовыя назвы і легенды, а таксама стварыў першую археалагічную карту Ашмянскага павета [4, с. 14].

У 30–50-х гг. XIX стагоддзя раскопкамі курганоў ва ўсходняй частцы басейна Нёмана займаўся Я.П. Тышкевіч. Ён раскапаў больш за 1000 курганных насыпаў. Вынікі сваіх даследаванняў апісаны ім у выданнях «Rzut oka na źródla archeologii krajowej» (1842) і «Badania archeologiczne nad zabytkami przedmiotów sztuk i rzemiosł w dawnej Litwie i Rusi Lietewskiej (1850), дзе курганы вызначаліся як славянскія пахаванні, а таксама было падкрэслена падабенства інвентару з балцкімі старажытнасцямі [3, с. 5]. Яго брат, Канстанцін Піевіч Тышкевіч, акрамя даследавання пахавальных помнікаў, першым грунтоўна і метадычна даследаваў беларускія гарадзішчы і гарады. Вынікі сваіх даследаванняў курганных могільнікаў ён прадставіў у кнізе «O kurganach na Litwie i Rusi Zachodniej» [35]. Хаця даследаванні К. Тышкевіча былі сканцэнтраваны пераважна ў Мінскай губерні і Лагойскім графстве ў прыватнасці. Ім таксама былі праведзены даследаванні ў даліне р. Віліі падчас яго этнаграфічнага падарожжа ў 1856 г., дзе ён апісаў гарадзішча, якое знаходзіцца непадалёк ад в. Быстрыца (Замкаўшчына) [22, с. 187]. Таксама ім былі даследаваны рэшткі могільніка ва Углянах (Данішава), курганы ў вёсках Шведы і Рызгоры [5, с. 5; 22, с. 183].

Самай значнай падзеяй у археалогіі краю сталася адкрыццё ў 1856 г. Віленскага музея старажытнасцей і стварэнне пры ім археалагічнай камісіі. Галоўнай мэтай камісіі была распрацоўка дакладнай методыкі па правядзенні археалагічных даследаванняў і рэестра ўсіх помнікаў Паўночна-Заходняга краю. Членам Віленскай археалагічнай камісіі, захавальнікам Віленскага музея старажытнасцей з'яўляўся Адам Кіркор. Ён значыўся ў рускім археалагічным таварыстве, якое ўпаўнаважыла яго да вывучэння беларуска-літоўскіх старажытнасцей. Дзякуючы яго дзейнасці на музейнай пасадзе пабачыў свет каталог Віленскага музея старажытнасцей [3, с. 5]. А. Кіркор быў і актыўным палявым даследчыкам, праводзіў раскопкі на дзясятках помнікаў: гарадзішчах, курганных могільніках, збіраў звесткі пра старажытныя ўрочышчы. Ім было раскапана больш за 1000 курганоў (напрыклад, Капачы Ашмянскага павета і Шаўры Лідскага павета). Яго цікавасць да вывучэння гарадзішчаў і старажытных абарончых збудаванняў вылілася ў апісанне помнікаў у Гальшанах, Юзуфаве, Радуні, Берштах, Касцянёве і інш. [3, с. 5; 4, с. 17; 6, с. 6]. У яго спісе помнікаў Віленскай губерні фігуруюць таксама гарадзішча Карабы, Мантацішкі, Шчэпановічы [11, с. 7]. У выдадзенай ім кнізе «Wycieczka archeologiczna po guberni Wileńskiej» А. Кіркор пакінуў дробныя гістарычныя нататкі пра мястэчкі Свір, Дабраўляны і іншыя месцы [28].

Этнограф, фалькларыст і археолаг Міхаіл Федароўскі займаўся археалагічнымі раскопкамі курганоў, могільнікаў і старажытных паселішчаў у Гродзенскім павеце Гродзенскай губерні, у Вілейскім і Лідскім паветах Віленскай губерні, збіраў матэрыялы для складання археалагічнай карты дагістарычнай Беларусі. Матэрыялы і вынікі гэтых работ захоўваюцца ў зборах Дзяржаўнага археалагічнага музея ў Варшаве, куды ён перадаваў каля 11 000 розных археалагічных знаходак на працягу 1877–1892 гг. [26, с. 60]. Некаторыя з прадметаў на сённяшні дзень з'яўляюцца часткай калекцыі аднаго з сябраў М. Федароўскага – этнографа, фалькларыста, гісторыка і археолага З. Глогера [12, с. 4]. Матэрыялы работ М. Федароўскага захоўваюцца ў бібліятэцы Варшаўскага ўніверсітэта, у Навуковым архіве Польскага этнаграфічнага таварыства ва Уроцлаве і архіве Польскай акадэміі навук [23]. У цяжкія гады Першай сусветнай вайны М. Федароўскі прадаў у антыкварную краму частку сваёй калекцыі, сярод якой, магчыма, былі і археалагічныя матэрыялы. 350 кніг і часопісаў ён ахвяраваў Інстытуту антрапалагічных навук Польшчы, астатнія кнігі, рукапісы і калекцыі завяшчаў сябрам-калекцыянерам С. Дэмбу, М. Абрамовічу, Я. Гамаліцкаму і інш.

Вялікую ролю адыгралі маштабныя даследаванні, якія папярэднічалі IX археалагічнаму з'езду 1893 г. у Вільні. Спецыяльна для гэтага была створана адмысловая праграмма, якая прадугледжвала поўную праверку помнікаў у рэгіёне ў адпаведнасці з наяўнымі дадзенымі, пошук і даследаванні новых помнікаў, запытванне інфармацыі аб прыватных калекцыях, стварэнне археалагічных карт і агульныя падсумаванне вынікаў [2, с. 11].

Асаблівай увагі ў гэты час заслугоўваюць даследаванні Ф.В. Пакроўскага, які раскапаў больш за сотню курганоў і даследаваў мноства гарадзішчаў у Павіллі і Беларуска-Літоўскім памежжы, што было выкладзена ў яго працах «Курганы на современной границе Литвы и Белоруссии» (1895 г.) [3, с. 7], «К исследованию курганов и городищ на восточной окраине современной Литвы» (1897 г.) [16], «К исследованию бассейна Вилии в археологическом отношении» (1899 г.) [15]. Ён даследаваў курганныя групы Будраны, Занарач, Засвір, Жэлядзь, Лоша, Лынтупы, Панізоўе, у х. Зязюлька, Чорная Лужа і ў многіх іншых месцах. Асабліва пахвальна аб працы і матэрыялах, сабраных Ф.В. Пакроўскім, адазваўся ўжо сучасны даследчык Панямоння Я.Г. Звяруга: «С исключительной тщательностью добытые, детально описанные и опубликованные материалы его раскопок являются ценным источником и для современных исследователей» [6, с. 7]. Ф.В. Пакроўскім былі ўпершыню раскапаныя і апублікаваныя матэрыялы гарадзішчаў Астраўляны (Мядзельскі раён), Якубішкі (Астравецкі раён), Свірскага паселішча ля в. Скарынкі (Мядзельскі раён) і інш. [5, с. 6]. Аднак галоўным яго дасягненнем было стварэнне і публікацыя археалагічных карт Віленскай і Гродзенскай губерняў, дзе была падсумавана ўся сабраная ім інфармацыя не толькі пра археалагічныя помнікі, але і пра асобныя выпадковыя знаходкі і месцы знаходжання скарбаў, культавыя камяні, вусныя паданні [13; 14]. Па выніках гэтых работ беларуска-літоўскі край стаў адным з найбольш поўна абследаваных і вывучаных на перыяд сярэдзіны XIX ст.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

у межах заходніх губерняў Расійскай імперыі, бо для большасці рэгіёнаў на той час яшчэ не існавала археалагічных карт [3, с. 7]. Над археалагічнымі картамі Віленскай і Гродзенскай губерняў працавалі таксама Э.А. Вольтэр і Е.Р. Раманаў, але іх карты так і не былі апублікаваны [10, с. 40]. Е.Р. Раманаў вельмі крытычна ставіўся да карт Ф.В. Пакроўскага, кажучы, што яго картамі можна карыстацца толькі ў якасці тапаграфічных даведнікаў, паколькі помнікі і месцы знаходак былі перададзены Ф.В. Пакроўскаму ад несвядомай і мясцовай інтэлігенцыі [24, с. 274].

З 80-х гадоў XIX стагоддзя на правым беразе Нёмана працуе археолаг В.А. Шукевіч. Ён выявіў мноства помнікаў розных эпох – ад каменнага веку да позняга сярэднявечча, але галоўнай яго заслугай з'яўляецца адкрыццё помнікаў новага віду – каменных могільнікаў, т. зв. «жальнічага тыпу», якія да яго археолагам Панямоння былі невядомыя [3, с. 8]. Шукевічам было раскапана 16 курганоў і 376 каменных магіл. Вынікі яго раскопак былі апублікаваныя ў польскамоўных выданнях, а рускамоўным навукоўцам сталі вядомыя дзякуючы публікацыям А.А. Спіцына [6, с. 9; 18; 19; 20]. Адначасова з ім у правабярэжжы Нёмана працаваў Э.А. Вальтэр. Ён раскапаў і абследаваў каменныя магілы ў Дварчанах, Пузелях, Апаноўцах, Вензаўшчыне, Сабалюнцах, Церамцы, Кутніках і інш. Гэтак жа ім былі апісаны прыватныя калекцыі С. Глогера, М. Федароўскага В. Шукевіча і іншых даследчыкаў у працы «Археологические коллекции частных лиц в Северо-Западном крае» [3, с. 8]. Аднак вынікі яго раскопак у большай меры не былі апублікаваны, звесткі пра гэтыя працы былі надрукаваны ў выглядзе кароткіх нататак на старонках «Виленского вестника» і «Правительственного вестника». Большая частка калекцыі В. Шукевіча з каменных магіл страчана. Тая частка з іх, якая сёння захоўваецца ў музеях, на жаль, дэпашпартызавана і можа выкарыстоўвацца толькі ў якасці статыстычнага матэрыялу [8, с. 20]. Абагульненне прац В. Шукевіча і Э.А. Вальтэра было зроблена А.А. Спіцыным, дзе ён назваў месцы даследаванняў, пералічыў прадметы, знойдзеныя ў магілах, даў кароткую знешнюю характарыстыку вонкаваму абліччу магіл, пахавальнаму абраду і інвентару [8, с. 18].

Сам А.А. Спіцын не займаўся раскопкамі, але вельмі плённа працаваў над ужо здабытымі матэрыяламі. Дзякуючы яго руплівасці ў навуковы свет выйшлі кнігі «Обозрение некоторых губерний и областей России в археологическом отношении», дзе ён зрабіў археалагічны агляд Гродзенскай і Віленскай губерняў [6, с. 9]. У працы «Предполагаемые литовские курганы VIII–IX вв.» ён вылучыў характэрныя рысы літоўскіх курганоў, а ў выданні «Расселение древнерусских племен по археологическим данным» сістэматызаваў матэрыялы з каменных магіл [21]. Самым важкім унёскам А. Спіцына ў навуку сталі абагульненне і сістэматызацыя велізарнага аб'ёму матэрыялу, напрацаванага археолагамі да пачатку XX стагоддзя. Яго высілкамі быў складзены агляд помнікаў археалогіі Гродзенскай губерні ад каменнага веку да сярэднявечча, ён абагульніў ўсе неапрацаваныя знаходкі з помнікаў усёй Прыбалтыкі (Літвы, Латвіі, Усходняй Прусіі, Эстоніі, Фінляндыі, Швецыі) у сваёй працы «Литовские древности» (1925 г.) [17]. Як пісала Ф.Д. Гурэвіч, «по охвату материала работа не имела себе равных» [3, с. 9].

Напрыканцы XIX – п. XX ст. археалагічныя працы ў рэгіёне сталі драбнейшымі. У канцы XIX ст. Г. Савіцкім пры земляных працах у паўночнай частцы Гальшанскага замка XVI–XVII стст. быў выпадкова выяўлены познасярэднявечны грунтовы могільнік. Г. Савіцкі даследаваў два пахаванні з матэрыяламі XIV ст. [8, с. 18].

У пачатку XX ст. у Панямонні эпізадычна працаваў С. Яроцкі, які раскопваў курганы ў сучасным Ашмянскім раёне, а вынікі сваіх даследаванняў апісаў у працы «Kurhany i cmentarzyska w pow. Oszmiańskim» 1901 г. [27]. П.С. Рыкаў даследаваў курганы ў в. Маркіняты і ў Смаргоні. Вынікі раскопак былі апісаны ў артыкулах паўночна-заходняга аддзялення Рускага Геаграфічнага Таварыства [3, с. 9; 6, с. 204].

Як мы бачым, на працягу XIX ст. археалагічнае вывучэнне правабярэжжа Беларускага Панямоння праходзілі дастаткова інтэнсіўна, але не ўсе гэтыя даследаванні адбываліся на аднолькавым навуковым узроўні. Таму варта ў разглядаемым перыядзе вылучыць наступныя этапы.

Першы этап – першая палова XIX ст. – 1856 г. Ён характарызуецца пачатковымі, кропачнымі даследаваннямі рэгіёна. Раскопваліся толькі асобныя пахаванні і прымітыўна абследаваліся гарадзішчы. Вынікі раскопак былі прадстаўлены простым апісаннем і першымі спробамі тэарэтычнай інтэрпрэтацыі.

Другі этап ахоплівае 1856–1893 гг. і звязваецца з маштабнымі праграмнымі даследаваннямі, усеагульным назапашваннем матэрыялаў, вялікімі раскопкамі могільнікаў і больш глыбокімі даследаваннямі гарадзішчаў, што рабілася пад эгідай наваствораната Віленскага музея старажытнасцей, і ў мэтах падрыхтоўкі да IX археалагічнага з'езда. У гэты час была сабрана найбольшая колькасць матэрыялаў, пачынаецца сапраўднае метадычнае вывучэнне старажытнасцей рэгіёна і навуковае абагульненне вынікаў даследаванняў.

Трэці этап прыпадае на пачатак XX ст., калі пасля правядзення IX археалагічнага з'езда раскопкі ў рэгіёне праводзіліся не так маштабна, працавалі толькі адзінкавыя археолагі. Больш увагі ў гэты час было засяроджана на апрацоўцы і публікацыях аглядных прац якія грунтаваліся на здабытых у папярэдні этап матэрыялах.

Такім чынам, дарэвалюцыйны перыяд вывучэння старажытнасцей Беларускага правабярэжжа Нёмана можна назваць перыядам набывання новых ведаў, удасканальвання методыкі археалагічных даследаванняў, здабычы, апрацоўкі матэрыялаў і першых фундаментальных высноў.

**Літаратура:**


1. Алексеев, Л.В. Археология и краеведение Беларуси в XVI в. – 30-е годы XX в. / Л.В. Алексеев. – Мн., 1996. – 213 с.
2. Вяргей, В.С. Археалагічнае вывучэнне Беларусі ў другой палове XIX ст. / В. Вяргей // Гістарычна-археалагічны зборнік / ІГ НАН Беларусі. – Мінск, 2006. – № 22. – С. 9–13.
3. Гуревич, Ф.Д. Древности Белорусского Понеманья / Ф.Д. Гуревич. – Москва-Ленинград: АН СССР, 1962. – 222 с.
4. Добриян, А.А. Деятельность Виленского музеума древностей и временной археологической комиссии по изучению археологических памятников / А.А. Добриян // Гістарычна-археалагічны зборнік / ІГ НАН Беларусі. – Мінск, 2006. – Вып. 22. – С. 14–19.
5. Зваруга, Я.Г. Беларускае Павілле ў жалезным веку і раннім сярэдневякоўі / Матэрыялы па археалогіі Беларусі, вып. 10. – Мінск: Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2005. – 174 с.
6. Зверуго, Я.Г. Верхнее Понеманье в IX–XIII вв. / Я.Г. Зверуго. – Минск: Наука и техника, 1989. – 208 с.
7. Каханоўскі, Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі / Г.А. Каханоўскі. – Мн., 1984. – 245 с.
8. Квятковская, А.В. Ятвяжские могильники Беларуси (конец XI – XVII в.) / А.В. Квятковская. – Вильнюс: "Diemedzio" leidykla, 1998. – 327 с.
9. Краўцэвіч, А.К. Гарады і замкі Беларускага Панямоння 14–18 стст.: Планіроўка, культурны слой / А.К. Краўцэвіч. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991. – 171 с.
10. Максімовіч, А.М. З гісторыі вывучэння археалагічных помнікаў басейна ракі Шчары / А.М. Максімовіч // Вестник Полоцкого государственного университета / 2014. – № 9. – С. 38–45.
11. Медведев, А.М. Верхнее Понеманье в железном веке и раннем средневековье / А.М. Медведев. – Минск: Беларус. навука, 2011. – 350 с.
12. Поболь, Л.Д. Древности Белоруссии в музеях Польши / Л.Д. Поболь. – Минск: Наука и техника, 1979. – 208 с.
13. Покровский, Ф.В. Археологическая карта Виленской губернии / Ф.В. Покровский. – Вильна: Типография А.Г. Сыркина, 1893. – 163 с.
14. Покровский, Ф.В. Археологическая карта Гродненской губернии / Ф.В. Покровский. – Вильна: Типография А.Г. Сыркина, 1895. – 165 с.
15. Покровский, Ф.В. К исследованию курганов Вили в археологическом отношении / Ф.В. Покровский // Тр. X археологического съезда в Риге 1896 г. – М., 1899. – Т.1. – С. 71–171.
16. Покровский, Ф.В. К исследованию курганов и городищ на восточной окраине современной Литвы / Ф.В. Покровский // Тр. IX археологического съезда в Вильне 1896 г. – М., 1897. – Т.2. – С. 138–196.
17. Спицын, А.А. Литовские древности / А.А. Спицын // Tauta ir žodis. Kaunas: Valtyb÷s Spaustuv÷, 1925. – Kn. III: Epe Lituana. Lib. III. – С. 112–171.
18. Спицын, А. А. Могильники с каменными кистами в Виленской губ. / А.А. Спицын // ИИАК / Типография главного управления уделов. – Санкт-Петербург, 1904. – Выпуск 12. – С. 26–29.
19. Спицын, А.А. Предполагаемые древности Черной Руси / А.А. Спицын // "Немного истории" [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://media0.webgarden.cz/files/media0:5105202314f14.pdf.upl/%C4%8Drus.pdf. – Дата доступа: 23.01.2018.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

20. Спицын, А.А. Раскопки В. Шукевича / А.А. Спицын // ИИАК / Типография главного управления уделов. – Санкт-Петербург, 1909. – Выпуск 29. – С. 68–70.
21. Спицын, А.А. Расселение древнерусских племен по археологическим данным / А.А. Спицын // «Руниверс» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://runivers.ru/bookreader/book459976/#page/483/mode/1up. Дата доступа: 23.01.2018.
22. Тышкевіч, К.П. Вілія і яе берагі / К.П. Тышкевіч; уклад., прадм., пер. пол. тэкстаў, камент. У. Васілевіча. – Мінск: Беларуская навука, 2018. – 636 с.
23. Федароўскі Міхал // Спадчына [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://spadchyna.net/index.php?option=com_content&view=article&id=1240:-federowski- & catid = 36: 2009-10-27-12-02-55 & Itemid = 467. – Дата доступу: 23.01.2018.
24. Чараўко, В. Вывучэнне пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. у дарэвалюцыйны перыяд / В. Чараўко // Гістарычна-археалагічны зборнік / ІГ НАН Беларусі. – Мінск, 2010. – Вып. 25. – С. 271–275.
25. Balinski, M., Starożytna Polska pod względem historycznym, jeograficznym, I statystycznym. / M. Balinski, T. Lipiński // S. Orgelbrand Księgarza przy ulicy Miodowej Nr. 496. – Warszawa, 1846. – T. 3. – s. 218–395.
26. Blombergowa, M.M. Badania archeologiczne Polaków na terytorium Imperium Rosyjskiego w XIX i początku XX w. / M.M. Blombergowa. – Łódź, 1993.
27. Jarocki, S. Kurhany i cmentarzyska w pow. Oszmiańskim, w gub. Wileńskiej / S. Jarocki // Instytut archeologii UW [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу:www.archeo.uw.edu.pl/swarch/swiatowit_III_1901_s46-48.pdf. Дата доступу: 23.01.2018.
28. Kirkor, A. Wycieczka archeologiczna po guberni Wileńskiéj / A. Kirkor // Biblioteka Cyfrowa [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://bc.wbp.lublin.pl/dlibra/docmetadata?id=3683&from=publication. Дата доступу: 23.01.2018.
29. Narbutt, T. O kurhanach: Badanie starożytności Litewskich / T. Narbutt // Tygodnik Wileński. – Wilno, 1818. – T. 7. – № 123.
30. Narbutt, T. Pomniejsze pisma historyczne, szczególnie do historii Litwy odnoszące się / T. Narbutt. – Wilno, Księgarza i Typografa Wilenskiego Naukowego Okręgu, 1856. – 300 с.
31. Narbutt, T. Pomniki do dziejów litewskich / T. Narbutt. – Wilno: Drukiem Jozefa Zawadskiego, 1847. – 265 с.
32. Narbutt, T. Dzieje starozytne narodu litewskiego / T. Narbutt // Pawet [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://pawet.net/library/history/bel_history/narbutt/%D0%9D%D0%B0%D1%80%D0%B1%D1%83%D1%82_%D0%A2%D0%B5%D0%B0%D0%B4%D0%BE%D1%80.html. – Дата доступу: 23.01.2018.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова